***Наталля Карбалевіч***

# ГРАМАДСКАЕ СТАЎЛЕННЕ ДА АСОБЫ Ў СЯЛЯНСКАЙ АБШЧЫНЕ БЕЛАРУСАЎ

Сялянская абшчына з'яўляецца складаным грамадскім утварэннем з разнастайным комплексам сацыяльных узаемаадносінаў, асаблівае месца ў якім займае стаўленне грамады да асобы. Фальклор утрымлівае звесткі пра сістэму ўяўленняў, каштоўнасцей, грамадскіх норм у асяродку абшчыны, пад непасрэдным ўздзеяннем якіх сяляне ставіліся да жыццёвых падзей і суабшчыннікаў.

Сумеснае існаванне членаў калектыву абшчыны, іх узаемная залежнасць, пастаянны цесны кантакт, адкрытасць для грамады дзеянняў і ўчынкаў асобнага чалавека стваралі пэўную сістэму ўзаемаадносінаў. Яна грунтавалася на ўзаемнай цікавасці, назіраннем за дзеяннмі кожнага – старога, малога, сацыяльным кантролі за паводзінамі, асабліва моладзі. Вясковае жыццё селяніна праходзіла «на людзях», якія ведалі амаль усё пра яго штодзённы побыт, сям'ю, характар, светапогляд. Натуральным вынікам гэтага была наяўнасць станоўчай або адмоўнай грамадскай думкі аб кожным чалавеку.

Сама працэдура грамадскага абмеркавання мае пад сабой выяўленне пэўных якасцей, здольнасцей, канстатацыю ці іх адсутнасць. Аб яе наяўнасці сведчаць фальклорныя факты – песні, прыказкі, прымаўкі. «*А ў нас мамухна чужая, / Ня будзець раненька будзіці, / Да пойдзець на вулку судзіці*» [14, *57*], «*Ніхто не знае, толька дзед да баба й цэлая грамада*» [11, *370*], «*Пайдзі да людзей, дык пачуеш, што дома робіцца*» [1, *76*]. Разам з тым прызнаецца, што кожны чалавек далёка не адкрытая кніга, якая лёгка чытаецца: «*Каб чалавека пазнаць, трэба з ім бочку солі з'есці*» [1, *288*].

Можна вылучыць пэўныя заканамернасці і механізмы грамадскага абмеркавання. Яно не мела штучных межаў, было шматвектарным у сваім распаўсюджанні, ахоплівала чальцоў абшчыны незалежна ад статусу. У поле зроку траплялі праявы існавання чалавека ў грамадзе: рысы характару, паводзіны, упарадкаванасць гаспадаркі: «*Якая Агатка, такая ў яе і хатка*» [1, *127*], «*Які розум, такая і гаворка*» [1, *271*]. Грамадская думка выходзіла за яе межы абшчыны, вандруючы ў іншую мясцовасць разам з чальцом абшчыны ці з госцем, які вяртаўся дадому. Наздарма казалі: «*Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей*» [14, *240*], «*Ці даўна тоя было, а ўжо й за ракой ведаюць*» [1, *113*], «*Не выткан ешчэ той платок, што б завязаць свету раток*» [1, *216*], «*Якой ракой плыць, такой і славай слыць*» [1, *141*].

Сфармаванае меркаванне было калі не агульнапрынятым, то вельмі ўстойлівым, прычым лічылася справядлівым: «*На каго людзі гавораць, на таго свінні рохкаюць*» [1, *62*], «*Якая рада, такая і грамада*» [1, *127*]. Аб яго значэнні сведчыць трываласць замацавання ў народнай свядомасці павагі да грамадскай думкі: «*Не дармо людзі гавораць*» [11, *370*], «*Не тое праўда, што*

*праўда, а тое, аб чым людзі гавораць*» [11, *370*], «*З пальца людзі не выссуць*» [11, *370*], «*Добрая слава лепш за багацце*» [11, *370*]. Грамадскае меркаванне арыентавалася на вясковыя нормы маралі, а пазней і рэлігіі: «*Ад Бога грэх і ад людзей смех*» [1, *13*], «*На каго Бог, на таго і людзі*» [1, *62*].

У той жа час грамадскі асяродак пакідаў нерэгламентаванымі (ці менш рэгламентаванымі) пэўныя сферы, паважаючы асабісты бок жыцця: «*Ніхто не ведае, як хто абедае*» [14, *253*], «*Як хто хоча, так па сваім бацьку плача*» [3, *133*], «*Усяк па-свойму Бога хваліць*» [1, *292*].

Можна вылучыць народныя ўсталёўкі, якія з'яўляюцца вынікам шматгадовага грамадскага назірання за чалавекам і паказваюць наяўнасць механізму народнага аналізу характару чалавека паводле яго ўчынкаў: «*Лепей з добрым згубіць, як з благім знайсці*» [14, *240*]. Пазнаць, што за чалавек, заўсёды вельмі проста па яго манеры жыць: «*Відаць пана па халявах» [8, 51]. «Пазнаюць сокала па палёту, а саву па паглёду*» [1, *76*]. У пэўных абставінах людзі паводзяць сябе подобным да іншых чынам: «*Як шанцуе, тады і Халімон танцуе*» [8, *159*], «*Хто ціха ходзіць, той густа месіць*» [1, *103*], «*Дурняў не сеюць, не гадуюць: яны самі родзяцца*» [3, *148*]. Не заўсёды чалавек насамрэч такі, якім спрабуе выглядаць: «*Сядзіць ціха, а думае ліха*» [1, *103*], «*Наверсе явор, а ў сярэдзіне д'ябал*» [1, *197*], «*Гарбатага і магіла не справіць*» [3, *155*], «*З дугі аглоблі не зробіш*» [3, *155*]. «У славянскай міфалогіі «крывізна» нярэдка гарантавала дасягненне дабрабыту і поспеху ў тых выпадках, калі звычайным (прамым) шляхам іх немагчыма было дасягнуць» [6, *27*]. Гэта значыць, што былі выпадкі, калі адступленне ад нормы не насіла толькі адмоўны характар.

Вывады грамадскіх назіранняў зводзяцца да наступнага: усе людзі розныя («*Бог лесу не параўнаваў, так і людзей не раўнуе*» [1, *278*]), кожны мае ўласныя рысы і звычкі («*Я йграю, як знаю, а ты скачы, як хочыш*» [1, *122*], «*Усякі маладзец дзелае на свой абразец*» [1, *164*]), асаблівасці кожнага вельмі трывалыя («*Крывога дзерава не выправіш*» [3, *150*], «*Чорна белым не стане*» [3, *150*]). І галоўнае: грамада пакідае за кожным права быць самім сабой, не прымушае да татальнай знітаванасці з асяродкам. У абшчыне існавала агульная мараль, агульныя законы існавання, агульны светапогляд, але гэтая нарматыўнасць не была штучнай, яна вынікала з жыцця людзей, з'яўлялася «жывым» асяродкам існавання чалавека. У межах агульнага светапогляду грамадская думка стымулявала кожнага чалавека да працэсу ўласнага мыслення, пакідала за ім права выбару, прызнаючы за кожным натуральныя асаблівасці характару: «*Парады слухай, ды не кожнай вер*» [1, *260*], «*Пад чужую дудку паскачаш – потым адплачаш*» [3, *148*], «*У суседа розуму не пазычыш*» [3, *97*], «*Кожная галава свой розум мае*» [3, *145*], «*Людзей слухай і свой розум мей*» [14, *238*], «*Трэба жыць, як з твайго калодзежа набяжыць*» [14, *239*], «*Калі Марцэля высьпіцца, дык і сама ўстане*» [1, *48*].

Кожны з'яўляецца свабодным у сваіх волевыяўленнях, але, калі апошнія супярэчаць цвярозаму розуму, такі чалавек не будзе выклікаць павагі і не будзе мець годную рэпутацыю сярод людзей. «*Вольнаму – воля, а*

*шалёнаму – поле*» [8, *52*], «*Яшчэ той не радзіўся, каб усяму свету дагадзіў*» [11, *377*], «*Дзяржы язык за зубамі, калі хочаш быць з людзямі*» [1, *283*], «*З кім жыць, таго не гнявіць*» [1, *286*]. Свабода гэтая існавала толькі да пэўных межаў, але межы гэтыя былі цалкам натуральныя. «Гавары, ды не ўсё дагары» [8, *56*]. Рэгламентацыя, забарона, заснаваныя на адпаведнасці грамадскіх нормаў уяўленням кожнага чалавека на ментальным узроўні, на існаванні агульнавядомых і агульнапрынятых, абавязковых для ўсіх сцверджанняў, які не патрабуюць доказу: «*І дурань ведае, што ў нядзелю свята*» [8, *73*], «*Што ў людзях вядзецца, то і ў нас не мінецца*» [11, *369*], «*З галавою не жыць, а з добрымі людзьмі*» [11, *369*], «*Ідзе грамада, і я туда*» [11, *368*].

На грамадскім стаўленні да асобы непазбежна адбіваліся і натуральныя адрозненні абшчыннікаў паводле полу і ўзросту. Паколькі значную ролю ў абшчыне адыгрывала гаспадарчае жыццё, дык галоўнае адрозненне вынікала з падзелу працы паміж мужчынамі і жанчынамі, малымі і старымі: «*Гумно плача па гаспадару, а хата па гаспадыні*» [1, *145*], «*Молодым росціцца, старым моліціся*» [1, *198*]. Паступова з гэтага вынікаюць і адпаведныя асаблівасцям дзейнасці і паводзінаў сацыяльна-ментальныя характарыстыкі той ці іншай полава-ўзроставай групы: «*Мужык возам не навозіцца, а баба рукамі ўсё перавозіць*» [1, *139*], «*Гдзе чорт сам не зробіць, туды бабу пашле*» [1, *145*], «*Стары з мусту, а без яго пуста*» [1, *94*], «*Старога паважай, малога павучай*» [3, *6*], «*Дзеду міла, а ўнуку гніла*» [8, 62], «*Стары са шляху не звядзе. І ў старой печы агонь добра гарыць*» [1, *94*].

Назіраецца і адмоўнае вылучэнне з агульнай супольнасці па полавай прыкмеце ў кірунку сцверджання перавагі мужчыны над жанчынай: «*Не кланяўся жук жабе, а дзед бабе*» [1, *155*]. Але гэта насіла хутчэй побытавы характар і не мела на мэце прынізіць жанчыну: у беларусаў яна ўспрымалася як паўнавартасны чалец роду ці сям'і. Да таго ж менавіта мужык з жонкаю мелі найбольш падстаў да знітаванасці інтарэсаў, змяншэння адасобленасці поглядаў і дзеянняў, як у адносінах паміж сабой, так і да ўсяго іншага: «*Дзед да баба – адна рада*» [1, *146*], «*Які чорт Хомка – такая яго жонка*» [8, *157*], «*Муж і жонка – найлепшая сполка*» [8, *94*]. Таксама трэба заўважыць, што прыказкамі абазначаецца права самастойнасці жанчыны ў пэўных (часцей за ўсё гаспадарчых) сферах дзейнасці: «*Не руш бабіных ігруш, баба натрасе, то сама прынясе*» [8, *105*].

Вельмі часта ў абшчыне да чалавека звярталіся, выкарыстоўваючы не афіцыальнае прозвішча і імя, а мянушку – таксама прадукт народнай творчасці. Такім чынам актуалізавалася своеасаблівая сістэма грамадскіх узаемаадносінаў і стваралася арыгінальная сфера духоўнай культуры. Прычына ўзнікнення мянушак, як правіла, практычная патрэба пры адноснай аднастайнасці прозвішчаў у межах аднаго, а часам і некалькіх вясковых паселішчаў хутка адрозніваць у размове абшчыннікаў. Але калі б патрэба была толькі ўтылітарная, то такія анамастычныя новатворы непазбежна былі б таксама фармальнымі. А гэтага не адбывалася. Мянушкі адрозіваюцца

разнастайнасцю, веданнем персанальных асаблівасцей чалавека, а часта і глыбокім пранікненнем у асобасныя характарыстыкі чалавека.

Мянушкі – дадатковыя неафіцыйныя найменні чалавека, якія выконваюць функцыю характарыстыкі асобы. Гэты індывідуальны знак абавязкова падмацаваны калектыўным прызнаннем створанай мянушкі. Аб сацыяльнай і выхаваўчай ролі мянушак іх даследчыца Т. Дзянісава сказала наступнае: «Мянушкі актыўна фармуюць асаблівую «мянушкавую свядомасць» індывідуума, якая стварае ў цэлым спрыяльны асяродак для актуалізацыі самаадукацыйнай і самавыхаваўчай дзейнасці чалавека, асабліва маладога, яго станаўлення як асобы» [7, *7*].

Існуюць розныя шляхі ўтварэння мянушак. У функцыі неафіцыйных антрапонімаў даволі часта ўжываюцца найменні жывёл з ярка выражанай метафарычнасцю. Утвараюцца мянушкі паводле выпадку з жыцця, характэрнай прыкметы знешнасці, характару, звычкі: «*Ляўшун, Маўчун, Скупы, Крыкун, Піскун, Крыварукі, Бяспалы, Гарапашчы, Хітрун, Віжун, Таўкач*» [15, *32*]. В. Шур паведаміў пра тураўскія мянушкі, спаслаўшыся на матэрыялы іх збіральніка: «У. Бобрык прыводзіць наступныя мянушкі, выяўленыя на Тураўшчыне: Латун, Красны, Рабы, Цыган, Дзежка. У аснове іх матывацыі – знешні выгляд чалавека. Частка мянушак характарызуе паводзіны чалавека, яго звычкі, фізічныя недахопы, дэфекты мовы і інш.: Драмак, Подмазка, Салап'ян, Пеўчук, Печонік, Сляпы, Гарбаты, Картаўка, Крывабока. Надзвычай ярка і трапна характарызуюць чалавека мянушкі, якія ўтварыліся ў выніку разнастайных метафар: Воўк, Казёл, Чайка, Ёрш. Так, мянушку Воўк чалавек атрымаў за нелюдзімы характар, Казёл – за ўпарты нораў і г.д.» [15, *35*].

Часта мянушка ахоплівала ўсіх чальцоў сям'і, а часам і роду. Гэта сведчыць аб тым, што рэпутацыя асобнага чалавека магла «перакрывацца» рэпутацыяй сям'і ці роду: «*Добрае карэнне, добрае і насенне*» [8, *64*], «*Які дубок, такі і клінок, які бацька, такі і сынок*» [3, *131*], «*Дурак не дурак, а родам так*» [3, *148*], «*Сабаку выбіраюць па псярні, а жонку па радні*» [1, *88*], «*Яко дрэва, такі сук; які дзед, такі ўнук*» [1, *170*], «*Хоць ты ўлажы шаты, калі ведаем, з якой ты хаты*» [1, *236*]. Адсюль вынікае, што менавіта сям'я адыгрывала ў абшчыне асноўную ролю, з'яўлялася цэнтрам існавання асобы.Аднак не выключалася магчымасць таго, што паводле сваіх учынкаў чалавек вылучаўся з сям'і ці нават супрацьпастаўляўся ёй у грамадска-абшчыннай свядомасці: «*Усякі род не без вырадка*» [12, *44*], «*Ніхто дзяцей не павіне, што іх бацькі свінні*» [12, *126*]. «*І на здаровай яблыні гнілы яблык знойдзецца*» [12, *127*], «*Адной маткі дзеткі, ды неаднолькавыя песьні пяюць*» [1, *17*].

Грамадскае стаўленне да чалавека будавалася на падставе супольнай сістэмы ўяўленняў, якія выпрацоўваліся дзякуючы калектыўнаму досведу, мелі на мэце захаванне маральна ўстойлівай абшчыны і абарону кожнага чалавека ўнутры яе. Выенікам грунтоўнага, аб'ектыўнага грамадскага аналізу паводзінаў і асабістых рысаў чалавека, з'яўлялася добрая або дрэнная рэпутацыя абшчынніка, якая часта адлюстроўвалася ў яго мянушцы. Такім

чынам ствараласа сістэма грамадскага меркавання, у якой кожны асобны чалавек меў свае ўласнае месца. З аднаго боку, яно адпавядала яго здольнасцям і якасцям, з другога – павінна было прынесці найвялікшую карысць грамадзе.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Аксамітаў, А. С.* Прыказкі і прымаўкі: Тлумач. слоўн. бел. прыказак і прымавак з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. / А. С. Аксамітаў. – Мінск, 2002.

2. *Анимелле, Н.* Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник. – Спб., 1854. Вып. II.

3. Анталогія беларускай народнай прыказкі, прымаўкі і выслоўя / уклад. Фядосік А. С. – Мінск, 2002.

4. Беларусы: у 12 т. / рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.] / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Т.6: Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў, В. М. Бялявіна, А. У. Гурко [і інш.]. – Мінск, 2002.

5. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск, 1993.

6. *Дзерман, А.* Архаічнае права Беларусі і традыцыйная правасвядомасць / А. Дзерман // Беларускі гістарычны часопіс. 2007. № 12. С. 25–30.

7. *Денисова, Т. Т.* Прозвища как вид антропонимов и их функционирование в современной речевой коммуникации (на материале прозвищ Шумячского и Ершичского районов Смоленской области) / Т. Т. Денисова. Автореферат дис. на соиск. уч. ст. к.ф.н. – Смоленск, 2007.

8. *Іванова, С.* Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў: Лінгвакраіназнаўчы дапаможнік / С. Іванова, Я. Іваноў. – Мінск, 1997.

9. *Лапицкая, Н. И.* Имена собственные в русских и белорусских заговорах / Н. И. Лапицкая. Автореферат дис. на соиск. уч. ст. к.ф.н. – Минск, 2000.

10. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / собр. и привед. в порядок П. В. Шейном. Т.1. Ч. 2: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – СПб., 1890.

11. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. Кн. 1 / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск, 1976.

12. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. Кн. 2./ рэд. А. С. Фядосік. – Мінск, 1976.

13. Слоўнік асабовых уласных імён / уклад. М. Р. Суднік; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск, 2005.

14. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў/ уклад., сістэматызацыя тэкстаў і камент. В. І. Скідана, А. М. Хрушчовай; уступ. арт. Т. В. Валодзінай; навук. рэд. А. С. Ліс. – 2-е выд. – Мінск, 2005.

15. *Шур, В. В.* З гісторыі ўласных імёнаў / пад рэд. П. У. Сцяцко / В. В. Шур. – Мінск, 1993.